УДК 56(476)«11»

Вольга ЕМЯЛЬЯНЧЫК
Сяргей ВАСІЛЬЕЎ
Аляксей КОЦ

Элітныя пахаванні XII ст. Спаса-Праабражэнскага храма Полацкага Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра


Полацк з'яўляецца ўнікальным беларускім горадам з непаўторнай гісторыяй і культурай. Ён значна вылучаўся сярод іншых гарадоў Усходняй Еўропы. У старажытнарускі час тут склалася свая княская дынастыя, якая праіснавала больш за два стагоддзі.

Ключавыя словы: *Полацк, Спаса-Праабражэнскі храм, пахавальныя канструкцыі, аркасоліі, саркафагі, элітныя пахаванні, краніялогія, палеагенетыка*

У XI—XII стст. Полацк актыўна развіваўся і займаў вельмі значную тэрыторыю. Археалагічныя матэрыялы дазваляюць вызначыць, што тут пражывала як гарадское насельніцтва, якое займалася сельскай гаспадаркай, так і рамесны люд, гандляры, баярства і інш. Засведчыць прысутнасць той ці іншай катэгорыі насельніцтва нам дазваляюць знаходкі матэрыяльнай культуры. Але ахарактарызаваць антрапалагічныя асаблівасці розных сацыяльных груп сярэднявечнага насельніцтва да нядаўняга часу было немагчыма ў сувязі з адсутнасцю матэрыялаў пахаванняў.

У 2014 г. на Стрэлцы Ніжняга замка полацкімі археолагамі ўпершыню быў выяўлены і даследаваны сярэднявечны некропаль XIII—XIV стст. [2]. У 2021—2022 гг. на тэрыторыі Верхняга замка быў даследаваны самы старажытны на сённяшні час хрысціянскі некропаль XI—XIII стст. [8]. Атрыманы ў выніку даследаванняў шкілетны матэрыял дазволіў антраполагам скласці больш поўную характарыстыку гарадскога насельніцтва Полацка гэтага часу [11].

Што датычыць прадстаўнікоў вышэйшага саслоўя сярэднявечнага Полацка, то месцы элітных пахаванняў былі ў розны час выяўленыя ў саркафагах пры старажытнарускіх храмах, сярод якіх Полацкі Сафійскі сабор [1, с. 22—23], храм-пахавальня полацкіх епіскапаў [5, с. 243], храм на Стрэлцы Ніжняга замка [12, с. 142—161]. Аднак частка даследаваных саркафагаў не ўтрымлівала шкілетных парэшткаў, у астатніх выпадках падобны матэрыял не быў перададзены на антрапалагічную экспертызу і пазней быў страчаны. Даследаванні пахаванняў Полацкага Спаса-Праабражэнскага храма дазволілі нам пачаць адкрываць гэтую гістарычную старонку.



трасіроўка сцен галерэй з элементамі рэканструкцыі.
абазначэнне пахавальных саркафагаў.

1 — пахавальныя аркасолії ў інтэр'еры храма.
2 — аркасолій у інтэр'еры паўднёвай галерэі.
3 — аркасолій у паўночнай сцяне падзямнага храма.
4 — саркафаг з пераадкладзенымі жаночымі чарапамі XII ст.
5 — саркафаг з некранутым пахаваннем XII ст.
6 — саркафаг з пераадкладзеным мужчынскім чэрапам XII—XIII стст.

Рэканструкцыя плана Спаса-Праабражэнскага храма Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра з пазначэннем саркафагаў (аўтары Я.М.Торшын і П.Л.Зыкаў з дапаўненнямі А.Л.Коца).

❖❖❖

Спаса-Праабражэнскі храм, як і іншыя храмы старажытнарускага часу, з моманту свайго стварэння задумваўся як храм-пахавальня. Гэтую ідэю ў свой час выказаў вядомы расійскі мастацтвазнаўца і мастак-рэстаўратар У.Д.Сараб'янаў [13, с. 21]. Археалагічныя адкрыцці апошніх гадоў пацвердзілі гэтую здагадку. У ходзе архітэктурна-археалагічных даследаванняў у сценах храма быў выяўлены шэраг аркасоліяў (арачных ніш для размяшчэння праху памерлых), а таксама каменныя саркафагі XII ст., першапачаткова размешчаныя ўздоўж паўднёвай і паўночнай сцен пад падлогай абыходных галерэй.

У XVI—XVIII стст., калі манастыр знаходзіўся ў валоданні ордэна езуітаў, храм быў значна перабудаваны: абыходныя галерэі XII ст. былі разабраныя, пад царквой былі збудаваныя крыпты, прызначаныя для пахавання кіраўнікоў ордэна. У другой палове XVII — пачатку XVIII ст. вакол святыні пачынаюць дзейнічаць гарадскія прыхрамавыя могілкі. З сярэдзіны XIX ст., пасля вяртання храма і манастыра Праваслаўнай царкве, тут хавалі толькі святароў і манахінь. Такім чынам, Спаса-Праабражэнскі храм выконваў сваю функцыю як месца пахаванняў увесь час.

Звернемся да найбольш старажытных пахавальных збудаванняў храма XII ст. Размяшчэнне аркасоліяў і саркафагаў у прасторы царквы ўказвае на тое, што яны прызначаліся для элітных слаёў насельніцтва. Прынята лічыць, што ўнутры храмавых комплексаў маглі быць пахаванымі прадстаўнікі княскага роду, епіскапы і іх набліжаныя, баярства, кцітары храма, святары, манахі, дойлід і майстры будаўнічай арцелі і інш.

Архітэктурна-археалагічныя даследаванні Спаса-Праабражэнскага храма дазволілі адкрыць і вывучыць некаторыя аркасоліі ў інтэр'еры Спаса-Праабражэнскага храма і амаль усе саркафагі ў прыбудаваных галерэях[1]. У паўночнай сцяне асноўнага аб'ёма храма быў амаль цалкам ускрыты распісаны фрэскамі аркасолій. Першапачатковыя памеры камеры, заглыбленай ніжэй за ўзровень падлогі, складалі 1,95 × 0,53—0,58 м. У хуткім часе пасля размяшчэння ў аркасоліі пахавання ў ім быў зроблены яшчэ адзін узровень, размешчаны вышэй, для другога пахавання. Сляды перабудоў фіксуюцца тут і па двух слаях фрэскавага роспісу. Да XVIII ст. рэшткі пахаванняў з аркасолія былі перанесены ў невядомае месца, камера засыпана зямлёй да ўзроўню падлогі, а прастора нішы закладзена брусковай цэглай для ўзмацнення сцяны. Такі самы лёс напаткаў аркасолій у паўднёвай сцяне, але пахавальная ніша ад цаглянай закладкі пры рэстаўрацыйных працах была ўскрыта толькі часткова. Яшчэ адзін аркасолій быў выяўлены ў паўднёвай галерэі, у прасторы пры другім прасле сцяны з захаду. Яго памер складаў 1,9 × 0,55 м. Аркасолій быў зроблены (вырублены) у кладцы сцяны і захаваўся ў вельмі разбураным стане, разам з тым тут таксама быў зафіксаваны фрэскавы жывапіс [14, с. 31—32].

У 2018 г. на тэрыторыі Спаса-Праабражэнскай царквы было зроблена ўнікальнае адкрыццё — выяўлены і даследаваны падземны храм. Падобныя збудаванні на тэрыторыі Усходняй Еўропы невядомыя. Канструкцыя адметная для ўсёй старажытнарускай архітэктуры [7, с. 192]. Сам падземны храм быў узведзены для здзяйснення ў ім пахавання, для чаго ў бакавой сцяне быў зроблены аркасолій. Знаходкі ў запаўненні падземнага храма фрагментаў абразка св. Георгія дазволілі выказаць здагадку, што дадзеная царква магла быць пабудаваная для пахавання бацькі Еўфрасінні Полацкай (полацкага князя, у хрышчэнні — Георгія), які мог з'яўляцца для манастыра кцітарам [7, с. 192].

Аркасолій, зафіксаваны ў паўночнай сцяне падземнага храма, меў даўжыню 1,47 м і шырыню 0,7 м (з улікам таўшчыны сценкі) прызначаўся для размяшчэння мошчаў, але і тут пахаванне было парушана, парэшткі адсутнічалі [7, с. 187]. Такім чынам, шкілетныя парэшткі з найбольш высокастатусных пахаванняў Спаскага храма былі пераадкладзены ці нават знішчаны ў больш позні час.

Падобны лёс напаткаў і касцяныя парэшткі з саркафагаў. У ходзе раскопак было зафіксавана не менш за 12 пахавальных камер, аднак можна меркаваць, што першапачаткова іх было каля 20. Частка з іх засталіся не раскапанымі ці былі цалкам знішчаны перакопамі і будаўнічымі працамі больш позняга часу. Саркафагі ўяўлялі сабой адзіночныя або трохчасткавыя камеры, значна заглыбленыя ніжэй за ўзровень тагачаснай падлогі. Сярэдні памер адзіночных саркафагаў — 1,9 × 0,55 м. Трохчасткавыя саркафагі складаліся з камер, падзеленых паміж сабой толькі сценкамі, асобныя камеры мелі памеры каля 1,9 × 0,52—0,56 м, у іншых выпадках — 1,8—2,0 × 0,5 м. Усе яны былі пабудаваныя з дробнай плінфы (старажытнай цэглы) і атынкаваныя ўнутры. Трохчасткавыя саркафагі размяшчаліся ў кампартыментах галерэй пры паўднёвым і паўночным уваходах у храм, а таксама ў заходнай частцы паўночнай галерэі. У астатніх выпадках саркафагі былі адзіночныя.

Археалагічнае даследаванне саркафагаў паказала, што амаль усе яны былі разбураныя, рэшткі пахаванняў у іх адсутнічалі. Некаторыя камеры былі цалкам разрабаваныя, у іх нават былі зламаны сценкі і прабіта падлога.

У 2015 г. каля паўднёвай сцяны быў знойдзены напаўразбураны каменны саркафаг XII ст., унутры якога знаходзіліся чалавечыя косці ў пераадкладзеным стане. Косці посткраніяльнага шкілета, прадстаўленыя

[1]Даследчыя работы вяліся ў 2015, 2017—2024 гг. сумеснай экспедыцыяй Полацкага дзяржаўнага ўніверсітэта імя Еўфрасінні Полацкай (кіраўнікі А.Л.Коц, Д.У.Дук, І.У.Магалінскі) і Дзяржаўнага Эрмітажа (кіраўнік Я.М.Торшын, даследчыкі П.Л.Зыкаў і В.М.Мацвееў). Антрапалагічную экспертызу матэрыялаў пахаванняў здзяйснялі спецыялісты Полацкага ўніверсітэта В.А.Емяльянчык і Д.С.Камінская.

фрагментамі розных аддзелаў, належалі грацыльнай жанчыне невысокага росту (каля 156 см). Чэрап захаваўся добра, разам з ніжняй сківіцай. Стан аблітэрацыі швоў чэрапа адпавядае ўзросту каля 40—50 гадоў. Па памерах чэрап вялікі, нават па мерках мужчынскіх узораў, масіўны, з умерана развітым рэльефам.

Спалучэнне даліхакраніі, шырокіх і нізкіх арбіт уяўляе сабой комплекс прыкмет, які можна ахарактарызаваць як "архаічны"; падобны комплекс быў характэрны для насельніцтва Полацкай зямлі старажытнарускага часу. Гэта дазволіла выказаць папярэдняе меркаванне, што чэрап мог належаць асобе, пахаванай у саркафагу яшчэ ў XII ст., аднак дакладнае датаванне касцей заставалася пад пытаннем. З улікам адсутнасці анатамічнага парадку размяшчэння касцей, а таксама таго факта, што косці посткраніяльнага шкілету адрозніваліся ад чэрапа больш цёмным колерам і горшым станам захаванасці, была зроблена выснова, што чэрап і посткраніяльны шкілет належалі розным індывідам, магчыма, пахаваным у суседніх камерах аднаго саркафага.

У 2019 г. пры паўночна-заходнім куце храма быў выяўлены саркафаг, у якім знаходзілася скапленне чалавечых парэштак, сярод якіх мелася 5 чарапоў і разрозненыя косткі посткраніяльнага шкілета розных індывідаў. Усе чарапы з саркафага належалі жанчынам рознага ўзросту (20—30, 30—40, 40—50 год), дзве жанчыны мелі ўзрост больш за 50 год.

Выходзячы з пераадкладзенага характару шкілетных парэшткаў з саркафага, заканамерна ўзнікла пытанне аб тым, ці не адносяцца яны да позніх пахаванняў XVII—XVIII стст. ля сцен храма. Былі праведзены вымярэнні чарапоў у адпаведнасці са стандартнай краніяметрычнай праграмай. Ужо на ўзроўні апісальнай характарыстыкі стала відавочным, што жаночыя чарапы з саркафага адрозніваюцца ад выбаркі больш позніх пахаванняў ля сцен храма формай мазгавога аддзелу. Два чарапы з саркафага мелі даліхакранную форму[2], тры — мезакранную[3], у той час як большасць позніх пахаванняў характарызавалася брахікраніяй[4]. Добра прафіляваны ў гарызантальнай плоскасці твар з моцным выступаннем насавых костак жанчын з саркафага ўказвае на выражаны комплекс еўрапеоідных рыс. Акрамя гэтага, жанчыны з саркафага вылучаліся такім комплексам рыс, як спалучэнне высокага твару, высокіх арбіт і вузкага носа, што не з'яўляецца характэрным для мясцовага карэннага насельніцтва Беларускага Падзвіння. Параўнанне двух выбарак жаночых чарапоў (познія пахаванні каля сцен храма і чарапы з саркафага) з выкарыстаннем t-крытэрыю Ст'юдэнта пацвердзіла статыстычна пэўныя адрозненні выбаркі з саркафага па чарапным паказальніку, вышыні арбіты і арбітным паказальніку [4, с. 119].

Падоўжаная форма мазгавога аддзелу чэрапа была ўласцівая для сярэднявечнага славянскага насельніцтва Усходняй Еўропы, прадстаўленага курганнымі пахаваннямі XI—XIII стст. На працягу апошняга тысячагоддзя мазгавы аддзел паступова змяняўся за кошт скарачэння падоўжанага дыяметра і павелічэння папярочнага, набываючы больш круглую форму (т. зв. працэс брахікефалізацыі). Гэты эпахальны працэс пацверджаны шматлікімі даследаваннямі і носіць панайкуменны характар.


Паколькі па форме мазгавога аддзела чарапы з саркафага маюць падабенства з сярэднявечным насельніцтвам Полацкай зямлі, было праведзена параўнанне з курганнай выбаркай жаночых чарапоў з гэтай тэрыторыі. Па выніках аналізу з выкарыстаннем t-крытэрыю Ст'юдэнта было ўстаноўлена, што выбарка з саркафага статыстычна пэўна адрозніваецца ад курганнай выбаркі больш шырокім мазгавым аддзелам, вузейшым тварам і больш высокімі арбітамі. Такім чынам, марфалагічная своеасаблівасць выбаркі жаночых чарапоў з саркафага дазволіла выказаць папярэднюю гіпотэзу аб тым, што яны могуць адносіцца да старажытнарускага часу, мець немясцовае паходжанне і належаць прадстаўніцам мясцовага княжацкага роду Рагвалодавічаў-Рурыкавічаў. Аднак датаванне пераадкладзеных шкілетных парэшткаў з саркафага з дапамогай радыевугляроднага аналізу, на жаль, не дало пераканаўчага пацвярджэння гэтай гіпотэзы.

У 2020 г. уздоўж паўночнага фасада царквы (пры другім з захаду прасле сцяны) быў упершыню зафіксаваны саркафаг з некранутым пахаваннем. Касцяныя парэшткі размяшчаліся ў анатамічным парадку, чэрап і грудная частка былі пашкоджаныя. Касцяк залягаў на падлозе саркафага ў выцягнутым стане, арыентаваны галавой на захад строга па восі храма. Рукі былі складзены на жываце. Суправаджальны інвентар дазволіў дакладна датаваць пахаванне ў межах XII ст. Да яго адносяцца начынне конусападобнай формы з празрыстага шкла, выяўленае каля левай ступні, і тры кавалкі плінфы пад галавой без слядоў выкарыстання ў будаўніцтве. Вядома, што плінфа або яе асобныя кавалкі выкарыстоўваліся ў пахаваннях XI—XIII стст. [6, с. 26]. Шкляное начынне было зафіксавана ў раструшчаным выглядзе. У межах пахавальнага комплексу яго можна датаваць XII ст., але ёсць прыклады, калі падобны посуд мае і больш вузкае датаванне — у межах першай паловы XII ст. [3, с. 35—36, с. 117]. Яшчэ некалькі фрагментаў шкляного начыння было выяўлена пад час раскопак паўднёвай галерэі ў непасрэднай блізкасці да трохчасткавага саркафага каля паўднёвага ўваходу ў храм. Яно мела насычаны сіні колер з белым малюнкам. Падобнае шкло магло паступаць у Полацк з Сірыі. Можна дапусціць, што дадзенае начынне таксама з'яўлялася пахавальным інвентаром.

[2]Даліхакранны тып чэрапа — варыянт формы чэрапа чалавека, які характарызуецца значнай перавагай падоўжанага дыяметра над папярочным.

[3]Мезакранны тып чэрапа характарызуецца ўмерана шырокай і ўмерана доўгай галавой.

[4]Брахікранны тып чэрапа характарызуецца шырокай і кароткай формай чэрапа, з перавагай папярочных памераў над падоўжанымі.



Партрэтная рэканструкцыя жанчыны з пераадкладзенага пахавання ў саркафагу, даследаваным у 2019 г. (1 — чэрап 2, 2 — чэрап 4, аўтар графічнай рэканструкцыі А.У.Расказава) [10].

У выніку правядзення антрапалагічнай экспертызы было ўстаноўлена, што шкілет належаў жанчыне ва ўзросце 20—30 гадоў. Чэрап, на жаль, быў разбураны, што не дазволіла ажыццявіць яго вымярэнняў. Па выніках вымярэння доўгіх трубчастых костак была разлічана прыжыццёвая даўжыня цела жанчыны, якая склала каля 168 см. Улічваючы, што ў XI—XIII стст. сярэдняя даўжыня цела палачанак складала каля 159 см [11, с. 239], маладая жанчына з саркафага мела даволі высокі рост, пры агульнай грацыльнай будове шкілета (тонкія косці, выцягнутыя прапорцыі цела).

Узоры шкілетных матэрыялаў з двух саркафагаў, даследаванных у 2019 і ў 2020 гг. (пераадкладзеныя парэшткі ў саркафагу і некранутае пахаванне XII ст. з разбураным чэрапам), былі накіраваны на генетычны аналіз у лабараторыю гістарычнай генетыкі Маскоўскага фізіка-тэхнічнага інстытута (Расійская Федэрацыя). У выніку было ўстаноўлена поўнае супадзенне мітахандрыяльнай ДНК узораў двух чарапоў з пераадкладзенага пахавання з парэшткамі з некранутага саркафага, што ўказвае на высокую верагоднасць іх роднасці па жаночай лініі. Наяўнасць блізкай роднаснай сувязі паміж жанчынамі дазволіла пацвердзіць гіпотэзу аб тым, што пераадкладзеныя парэшткі з саркафага адносяцца да старажытнарускага часу. Іх гаплагрупа была вызначана як H1b1, еўрапейская (не фінская). Да гэтай групы прымыкае ўзор яшчэ аднаго жаночага чэрапа з пераадкладзенага пахавання, што дазваляе выказаць гіпотэзу аб наяўнасці роднасных сувязяў з трыма вышэйзгаданымі чарапамі. Узоры яшчэ двух жаночых чарапоў маюць гаплагрупы H59 і H5a, якія адносяцца да агульнай каранёвай гаплагрупы H і маюць аналагічную еўрапейскую (не фінскую) лакалізацыю [9, с. 122]. Гэта дазваляе пацвердзіць раней выказаную гіпотэзу пра тое, што выяўленыя і даследаваныя парэшткі з пахаванняў у саркафагах маглі належаць прадстаўніцам мясцовага княжацкага роду Рагвалодавічаў-Рурыкавічаў, бліжэйшым сваячкам прападобнай Еўфрасінні Полацкай.

Візуалізаваць вонкавае аблічча людзей, якія жылі ў далёкім мінулым, дазваляюць метады, распрацаваныя супрацоўнікамі Лабараторыі антрапалагічнай рэканструкцыі Інстытута этналогіі і антрапалогіі Расійскай акадэміі навук. У рамках сумеснага беларуска-расійскага праекта была ажыццёўлена партрэтная рэканструкцыя аблічча жанчын, пахаваных у саркафагах XII ст. [10].

❖❖❖

Такім чынам, у ходзе архітэктурна-археалагічных даследаванняў Спаса-Праабражэнскага храма ў Полацку былі ўскрыты мураваныя канструкцыі саркафагаў, якія прызначаліся для пахавання прадстаўнікоў княскага роду, епіскапаў, баярства, кцітараў храма, святароў, манахаў і інш. Большасць саркафагаў была разбурана і не ўтрымлівала пахаванняў з прычыны разбурэння галерэй і здзяйснення на іх месцы пахаванняў XVIII—XIX стст. Толькі ў двух саркафагах захаваліся пераадкладзеныя парэшткі, якія можна суаднесці з насельніцтвам XII ст., а яшчэ адзін утрымліваў некранутае сярэднявечнае пахаванне. Архітэктурна-археалагічныя даследаванні дазволілі вывучыць і канструкцыі некаторых пахавальных аркасоліяў у сценах храма, у тым ліку і ў прасторы ўнікальнага падземнага памяшкання. Па характары пахавальных канструкцый і іх размяшчэнні Спаская царква мае падабенства з храмам-пахавальняй, які размяшчаўся побач у манастыры.

У выніку антрапалагічнага даследавання ўдалося вылучыць з асноўнай масы позніх пахаванняў XVII—XVIII стст. шкілетныя парэшткі, якія належалі высокастатусным жанчынам, пахаваным у XII ст. Была ўстаноўлена марфалагічная спецыфіка пераадкладзеных жаночых чарапоў з саркафага, што дазволіла выказаць папярэднюю гіпотэзу аб тым, што яны могуць адносіцца да старажытнарускага часу і належаць прадстаўніцам мясцовага княжацкага роду Рагвалодавічаў-Рурыкавічаў. Генетычны аналіз шкілетных матэрыялаў з некранутага саркафага XII ст. і пераадкладзенага пахавання дазволіў устанавіць наяўнасць іх блізкай роднаснай сувязі па жаночай лініі, што ўскосна пацвярджае гэтую гіпотэзу.

1. Антипов, И. В. Архитектурно-археологические исследования Софийского собора в Полоцке в 1975—1980, 1984 годах / И. В. Антипов, Д. Д. Ёлшин, А. В. Жервэ, Е. А. Немыкина, А. В. Трушникова, А. А. Фрезе // Архитектурное наследство. — СПб. : Коло. — 2021. — № 74. — С. 16—28.

2. Дук, Д. У. Могілкі на стрэлцы Ніжняга замка ў Полацку / Д. У. Дук, В. А. Емяльянчык, А. Л. Коц // Матэрыялы па археалогіі Беларусі : зб. навук. артыкулаў / гал. рэд. В. М. Ляўко. — Мінск : Беларуская навука, 2018. — Вып. 29 : Даследаванні пахавальных і пасяленчых помнікаў эпохі сярэдневякоўя і Новага часу на тэрыторыі Беларусі і суседніх краін. — С. 171—182.

3. Гуревич, Ф. Д. Древний Новогрудок (посад — окольный город) / Ф. Д. Гуревич. — Л. : Наука, 1991. — 159 с.

4. Емельянчик, О. А. Опыт дифференциации разновременных погребений при Спасо-Преображенском храме Спасо-Евфросиниевского монастыря в Полоцке / О. А. Емельянчик // Актуальные вопросы антропологии. Вып. 20 / Институт истории НАН Беларуси. — Минск : Беларуская навука, 2025 — С. 108—125.

5. Каргер, М. К. Храм-усыпальница в Евфросиньевском монастыре в Полоцке / М. К. Каргер // Советская археология. — 1977. — № 1. — С. 241—244.

6. Коц, А. Л. Плінфа ў пахаваннях XI—XIV стст. у Полацку / А. Л. Коц // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. — 2024. — № 1(69). — С. 24—28.

7. Магалінскі, І. У. Вынікі археалагічных даследаванняў на тэрыторыі Спаса-Еўфрасіннеўскага манастыра каля Спаса-Праабражэнскага храма ў горадзе Полацку ў 2018 годзе / І. У. Магалінскі, А. Л. Коц, Я. М. Торшын, П. Л. Зыкаў, В. М. Мацвееў // Матэрыялы па археалогіі Беларусі. Даследаванне беларускіх старажытнасцей (да 80-годдзя з дня нараджэння А. Г. Калечыц). — Вып. 31. — Мінск : Беларуская навука, 2020. — С. 188—196.

8. Магалінскі, І. У. Папярэднія вынікі даследавання могільніка XI—XIII стст. на тэрыторыі Верхняга замка Полацка / І. У. Магалінскі, В. А. Емельянчык, А. Л. Коц, П. М. Кенько // Вестник Полоцкого государственного университета. Серия А, Гуманитарные науки. — 2023. — № 2 (67). — С. 6—12.

9. Мустафин, Х. Х. Отчет о научно-исследовательской работе исследования полного митохондриального генома образцов из погребального памятника г. Полоцка (заключительный этап) / Х. Х. Мустафин // Лаборатория исторической генетики. — Долгопрудный, 2024. — 24 с.

10. Население Древней Руси (Альбом в лицах) / С. В. Васильев, А. В. Рассказова, Е. А. Просикова, Е. В. Веселовская, Ю. В. Рашковская, Н. В. Харламова, С. Б. Боруцкая, О. И. Алехина, С. Ю. Фризен, О. А. Емельянчик, Х. Х. Мустафин, И. Э. Альборова. — М.: АМА-Пресс, 2024. — 180 с.

11. Новые данные по антропологии средневекового населения города Полоцка / О. А. Емельянчик, Е. В. Веселовская, С. В. Васильев, Ю. В. Рашковская, Д. С. Каминская, И. В. Магалинский, А. Л. Коц // Сибирские исторические исследования. — 2023. — № 4. — С. 220—255.

12. Раппопорт, П. А. Полоцкое зодчество XII века / П. А. Раппопорт // Советская археология. — 1980. — № 3. — С. 142—161.

13. Сарабьянов, В. Д. Спасская церковь Евфросиниевского монастыря в Полоцке / В. Д. Сарабьянов. — 3-е изд., доп. и перераб. — Полоцк : Спасо-Евфросиниевский женский монастырь в г. Полоцке Полоцкой епархии Белорусской Православной Церкви, 2016. — 513 с.

14. Торшын, Я. М. Спаса-Праабражэнская царква ў Полацку: вынікі архітэктурна-археалагічных даследаванняў 2017 г. / Я. М. Торшын, Д. У. Дук, П. Л. Зыкаў, А. Л. Коц // Беларускі гістарычны часопіс. — 2019. — № 2. — С. 28—34.

Паступіў у рэдакцыю 10.07.2025.

Бібліяграфія гісторыі Спаса-Праабражэнскай царквы ў Полацку ў "Беларускім гістарычным часопісе"

2004

Зелянкова Галіна, Цітоў Вадзім. Ефрасіння Полацкая (IV клас). № 12. С. 51.

Кушнярэвіч Аляксандр. Аналіз графічных выяў Сафійскага сабора ў Полацку. № 5. С. 44.

Ракуць Васіль. Ефрасіння Полацкая (факультатыўныя заняткі) (V—VI класы). № 1. С. 59.

2007

Калечыц Іна. Графіці XII—XIV стст. у Спаса-Праабражэнскай царкве ў Полацку. № 3. С. 37.

2011

Калечыц Іна. Алфавітныя надпісы і рысункі ў алтары Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы. № 7. С. 11.

Калечыц Іна. Малітоўныя надпісы-прашэнні ў алтары Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы. № 8. С. 31.

2012

Калечыц Іна. Графіці на слупах Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы. № 5. С. 32.

Лабоха Галіна. Кароткі нарыс гісторыі Спаса-Ефрасіннеўскага жаночага манастыра ў Полацку. № 10. С. 19.

2013

Калечыц Іна. Людзі і пачвары, кошкі і птушкі: рысункі-графіці ў Полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве. № 5. С. 25.

2014

Калечыц Іна. Новыя знаходкі графіці ў Полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве: аб месцазнаходжанні кліраса, эклезіяніме "Святы Спас" і гарадзецкім архімандрыце Іаане. № 7. С. 37.

2015

Дук Дзяніс, Калечыц Іна, Коц Аляксей. Пячатка Еўфрасінні Полацкай. № 7. С. 13.

2016

Калечыц Іна. Графіці выхаду на паўднёвую галерэю ў Полацкай Спаса-Праабражэнскай царкве. № 7. С. 17.

Торшын Яўген, Дук Дзяніс, Коц Аляксей, Іаанісян Алег, Зыкаў Пётр. Спасціжэнне першапачатковай задумы архітэктуры Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы: па выніках даследаванняў 2015 года. № 7. С. 5.

Ярмохін Максім, Вітас Адомас, Калечыц Іна. Дэндрахраналагічнае датаванне будаўніцтва Полацкай Спаса-Праабражэнскай царквы. № 8. С. 13.

Працяг на с. 59.